Газета дзяржаўнай установы адукацыі “Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа”



# Перапынак!



Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

№6
Люты, 2021

## Чытайце ў нумары:

Вечар сустрэчы стар. 2

Афганістан - ты боль маёй душы стар. 3

Дзень Абаронцаў Айчыны стар. 4

Бяспека кожны дзень стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# *Вечар сустрэчы школьных сяброў!*

Хутка мінулі школьныя гады, але засталіся дарагія сэрцу людзі, з якімі прыемна сустрэцца. Вечар сустрэчы – гэта не толькі вечар успамінаў, гэта, у першую чаргу, добры настрой, вясёлы адпачынак з сябрамі дзяцінства, любімымі настаўнікамі.

У гэтым годзе вечар сустрэчы прайшоў у форме “Дзень адкрытых дзвярэй”. Кожны жадаючы мог прыйсці і пагутарыць са сваімі класнымі кіраўнікамі і сябрамі. Вучні ж у сваю чаргу падрыхтавалі канцэртную праграму, якую можна паглядзець на сайце ўстановы. А таксама арганізавалі выставу фотаздымкаў выпускнікоў юбілейных гадоў











# *Афганістан – ты боль маёй душы*

И помним все войну, Афганистан,
И день чтим этот вывода военных.
Нам не забыть, конечно, ни потерь, ни ран,
Ни всех убитых, затерявшихся и пленных.

15 лютага ўнашай краіне адзначаецца памятная дата - Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У гэты дзень у 1989 годзе апошні савецкі солдат перайшоў мост пагранічнай ракі Амудар’я — завяршыўся вывад савецкіх войск з Афганістана. Вайна ў Афганістане працягвалася 9 гадоў 1 месяц і 18 дзен. Звыш 14 тысяч савецкіх воінаў загінулі на чужой зямлі, 6 тысяч памерлі ад ран і хвароб, 311 чалавек прапалі без вестак. Гэта былі самыя вялікія страты Савецкай Арміі пасля Вялікай Айчыннай вайны.

У нашай установе, як і ва ўсёй краіне прайло шмат мерапрыемстваў, якія былі прысвечаны гэтай даце.

















# Дзень Абаронцаў Айчыны

Гэты святочны дзень асаблівы ў нашай гісторыі. Сёння мы аддаём даніну павагі і ўдзячнасці беларускім воінам – тым, хто заўсёды аберагаў і працягвае аберагаць нашу Радзіму. Абарона свайго дома, сваёй Айчыны – найпершы абавязак, выкананне якога для кожнага чалавека – справа гонару. У гэты дзень жадаем дабра, шчасця, згоды і дабрабыту кожнай сям'і. Здароўя і даўгалецця ветэранам, паспяховай службы салдатам і афіцэрам. Няхай гэта свята адважных і мужных людзей заўсёды будзе мірным і радасным! Вучні нашай школы з задавальнннем іудзельнічаюць у спартыўных і забаўляльных мерапрыемствах, каб паказаць свой спрыт, лоўкасць, сілу і даказаць – **МЫ БУДУЧЫЯ АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ**











# Бяспека кожны дзень

У другой палове лютага на ўсёй тэрыторыі нашай краіны праходзіць акцыя **«Адзіны дзень бяспекі»**. У яе рамках праходзяць прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на папярэджанн надзвычайных сітуацый, правапарушэнняў, а таксама навучанню паводзінам ва ўмовах пажараў, аварый, аказанню першай дапамогі.













# Весткі з дзіцячага сада

У апошнім месяцы  зімы нам зусім не было сумна. Мы сняткавілі дні нараджэння нашых сяброў. Праводзілі дні пажарнай і дарожнай бяспекі. І віншавалі нашых татаў з Днём Абаронцаў Айчыны.








